**А. Мікула**

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ПРЭДЫКАТЫЎНЫХ КАНСТРУКЦЫЙ У АМЕРЫКАНСКІМ КІНАДЫСКУРСЕ (на прыкладзе серыялаў «У лепшым свеце» і «Бруклін 9-9»)

*Прэдыкатыўныя канструкцыі* – адна з найважных асаблівасцяў англамоўнага сінтаксісу, з'яўляючыся адзінствам двух элементаў, звязаных адносінамі другаснай прэдыкацыі (Бяндзецкая). Мэта нашага даследавання палягае ў супастаўленні частотнасці ўжывання сінтаксічных функцый прэдыкатыўных канструкцый у сучасным амерыканскім кінадыскурсе на прыкладзе серыялаў «У лепшым свеце» і «Бруклін 9-9» (табліца).

Частотнасць выкарыстання прэдыкатыўных канструкцый у залежнасці ад сінтаксічнай функцыі

| Функцыя | Інфінітыў | Герундый | Дзеепрыметнік | Іншае | Агульная колькасць |
|---|---|---|---|---|---|
| Складаны дзейнік | 302 | 40 | 4 | – | 346 |
| Складаны прэдыкатыў | 13 | 50 | – | – | 63 |
| Складанае дапаўненне | 1941 | 119 | 486 | 462 | 3008 |
| Складаная акалічнасць | 32 | 20 | 38 | 13 | 103 |
| Складанае азначэнне | 73 | 73 | – | 1 | 147 |
| Складаная частка прэдыката | 3 | – | – | – | 3 |
| Агульная колькасць | 2364 (65 %) | 302 (8 %) | 528 (14 %) | 476 (13 %) | 3670 |

Як дэманструе табліца, найболей частотным дзеяслоўным элементам у складзе прэдыкатыўнай канструкцыі з’уляецца інфінітыў. Герундыйных зваротаў было зафіксавана менш за ўсё, прытым дадзеная канструкцыя ў большасці выпадкаў выконвае функцыю складанага дапаўнення: *I appreciate you trying to cheer me up* ‘Я ўдзячны за спробу падбадзёрыць мяне’.

Большасць канструкцый з інфінітывам – аб’ектны інфінітыўны зварот у функцыі складанага дапаўнення (65 %): *I think the lesson here is that we should not allow our competitiveness to interfere with the sanctity of our job* ‘Мне здаецца, навука ў тым, што мы не павінны дазваляць духу спаборніцтва перашкаджаць працы’. Акрамя таго, складанае дапаўненне з’яўляецца найбольш папулярнай сінтаксічнай функцыяй (82 %), а самая рэдкая сінтаксічная функцыя – складаная частка прэдыкатыва (<1 %): *These silences are very hard for me to read* ‘Мне цяжка зразумець, што значыць вашае маўчанне’.

У той жа час важна адзначыць, што вуснай форме маўлення ўласцівы шэраг асаблівасцяў, якія не дазваляюць адназначна вызначыць сінтаксічную ролю прэдыкатыўнай канструкцыі. Разгледзім наступны прыклад: *For some reason, I have trouble believing people actually have my back. I don’t know why. Probably my dad abandoning me.* Дадзены сказ можам аднавіць наступным чынам: *It is probably because of my dad abandoning me.* Можна лічыць, што прэдыкатыўная канструкцыя выконвае функцыю складанага прэдыкатыва.

Такім чынам, прэдыкатыўныя канструкцыі маюць розную структуру і шырока ўжываюцца ў кінадыскурсе, аднак іх сінтаксічныя функцыі не заўсёды лёгка вызначыць праз спецыфіку сітуацыі камунікавання.